ІХ МАЛАДОСЦЬ ПРЫПАЛА НА ВАЙНУ 5

НА АДАМОЎСКІХ МОГІЛКАХ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

6 МАЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 87 (29709)


## КАРАТКА

- **Аб'яўлены конкурс для назначэння стыпендый Прэзідэнта таленавітым маладым вучоным на 2023 год.**
- Красавік 2022 года стаў самым вільготным за перыяд з 1945-га.
- **Фестываль «Мінская вясна» стартуе ў Белдзяржфілармоніі.**
- Ацяпленне ў жылым фондзе Мінска пачнуць адключаць 10 мая.
- **Аб'яўлены прыём заявак на ўдзел у Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года — 2022».**
- Іван Бахар прызнаны найлепшым гульцом 6-га тура футбольнага чэмпіянату Беларусі.
- **У Расіі зарэгістравалі прэпарат супраць COVID-19 «Мірабівір».**
- «Белавія» паведамляе аб немагчымасці выканання рэйсаў у Алматы да асаблівага распараджэння.

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«10 чэрвеня 2021 года ўведзены ў прамысловую эксплуатацыю першы энергаблок Беларускай атамнай электрастанцыі. З моманту яго ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму (3 лістапада 2020 года) выпрацавана 9,3 млрд кВт•гадз. электраэнергіі, што дало магчымасць замясціць 2,3 млрд кубаметраў прыроднага газу. З уводам другога энергаблока штогадовы аб'ём вытворчасці электраэнергіі на АЭС складзе каля 18,5 млрд кВт•гадз., што дасць магчымасць замяшчаць каля 4,5 млрд куб. м газу ў год».*


ISSN 1990 — 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Развязваць нейкі канфлікт, нейкую вайнушку на Захадзе абсалютна не ў інтарэсах беларускай дзяржавы»

Фота БелТА.

**На злабадзённыя пытанні шчыра і адкрыта адказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю аднаму з найбуйнейшых міжнародных інфармацыйных агенцтваў — Associated Press. Інтэрв'ю ў беларускага лідара ўзяў віцэ-прэзідэнт АР Іан Філіпс. Ён працуе ў агенцтве з 1994 года, з'яўляўся ўласным карэспандэнтам у Бразіліі, Францыі, Вялікабрытаніі, узначальваў Усходне-Еўрапейскае бюро і бюро Блізкага Усходу, Афганістана і Пакістана. Інфармацыйнае агенцтва Associated Press аб'ядноўвае каля 7 тысяч газетных выдавецтваў, радыё- і тэлевізійных станцый, кіруе 248 бюро навін у 99 краінах свету. Падпісчыкамі платнага кантэнту агенцтва з'яўляецца больш за 10 тысяч розных медыярэсурсаў у 120 краінах, уключаючы беларускую НДТРК.**

У інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь рабіла і робіць усё, каб вайны паміж Украінай і Расіяй не было. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што беларускі бок катэгарычна не прымае ніякай вайны. Беларускі лідар падкрэсліў, што дзякуючы беларусам былі пачаты перагаворы паміж Украінай і Расіяй.


СТАР. 2


# ДРУЖНАЯ СЯЎБА

Фота Віктара ДРАЧОВА.

**З-за начных замаразкаў і частых дажджоў сёлета толькі нядаўна пачалі садзіць бульбу і сеяць яравыя вяскоўцы на гомельскім Палессі. У вёсках Жыткавіцкага раёна ў мінулыя выхадныя было асабліва шматлюдна. На дапамогу землякам прыехалі дзеці і сваякі з гарадоў і іншых абласцей. На прысядзібных участках вяскоўцы праводзілі пасяўную з дапамогай мотаблокаў, маленькіх самаробных трактароў і коней. А жыхару вёскі Перароў Мікалаю ЧАРНУШЭВІЧУ, які садзіў бульбу свайму суседу, дапамагаў нават яго любімы сабака.**

Па палічках

# «ВАГІ» ДЛЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

## Як карыстацца лічыльнікам электраэнергіі і эканоміць

**Спажыванне электрычнасці беларусамі не абмежавана ніякімі дакументамі — летась жыхары ўжылі 7 млрд кВт·г (больш за 23 % ад агульнай колькасці, якая траціцца па краіне). Аднак адпускаць гэтую энергію без дагавора і без наяўнасці «вагаў», то-бок лічыльніка электраэнергіі, нельга, кажуць у «Белэнерга». Акрамя таго, адключыць святло могуць (пасля пісьмовага папярэджання) праз два месяцы неаплаты. Дагавор на электрааб-слугоўванне з энергетыкамі ў Беларусі маюць 4 млн 707 тыс. бытавых абанентаў (грамадзян), у якіх усталяваны лічыльнікі. Хто і як павінен сачыць за спраўнасцю абсталявання і як можна законна паменшыць плату за электрычнасць, расказаў Віктар ЖЫТКЕВІЧ, начальнік упраўлення збыту энергіі «Белэнерга».**

### Ад індукцыйных да электронных

Напачатку жыхарам устанаўлівалі індукцыйныя лічыльнікі энергіі. Яны мелі дыск і клас дакладнасці 2,5. Лічыльнікі тых часоў знаходзіліся на абязлічаным абслугоўванні ў энергазабяспечвальных арганізацыях. На апошніх ляжала адказнасць і аплата ўсяго, што звязана з абслугоўваннем: праверка, рамонт і іншае, расказаў спецыяліст.

З 2000-х гадоў пачалі ўкараняцца першыя электронныя лічыльнікі. У дакументах Мінбудархітэктуры і Мінжылкамгаса было запісана, што ўсе шматкватэрныя дамы з колькасцю кватэр 20 і больш павінны быць аснашчаны Аўтаматызаванай сістэмай кантролю і ўліку электраэнергіі.


СТАР. 4

# «Развязваць нейкі канфлікт, нейкую вайнушку на Захадзе абсалютна не ў інтарэсах беларускай дзяржавы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Я ведаю пазіцыю Расіі. Ведаю, што прапануе Расія Украіне. Але чаму Украіна, на тэрыторыі якой ідзе фактычна вайна, ваенныя дзеянні, гінуць людзі, не зацікаўлена ў гэтых перагаворах, яшчэ адно пытанне. Але адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў Вашынгтоне», — заўважыў ён.

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што не думаў, што расійская спецаперацыя «зацягнецца такім чынам». Але адзначыў, што не настолькі паглыблены ў гэтую праблему, каб сказаць, ці па плане ў іх ідзе, у расіян, як яны гавораць. «Я яшчэ раз гэта падкрэсліваю: я гэта адчуваю так, што аперацыя гэтая зацягнулася», — сказаў ён.

Адказваючы на адно з пытанняў журналіста, Прэзідэнт канстатаваў, што развязваць канфлікт на Захадзе абсалютна не ў інтарэсах Беларусі. Па яго словах, мы нікому не пагражаем і пагражаць не збіраемся. І не будзем гэта рабіць. «Больш за тое, ды і пагражаць мы не можам: мы ведаем, хто нам супрацьстаіць. Таму развязваць нейкі канфлікт, нейкую вайнушку на Захадзе абсалютна не ў інтарэсах беларускай дзяржавы. Таму няхай Захад спіць спакойна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Іан Філіпс пацікавіўся, што думае беларускі лідар наконт гіпатэтычнай магчымасці прымянення ядзернай зброі ў выпадку зацягвання ваенных дзеянняў ва Украіне. Ён спытаў, ці лічыць Аляксандр Лукашэнка гэта ўвогуле дапушчальным, ці не з'яўляецца гэта нейкай чырвонай лініяй. «Абсалютна лічу, што прымяненне ядзернай зброі недапушчальна яшчэ і таму, што гэта побач з намі. Не зусім тут, але не за акіянам, як Злучаныя Штаты. Недапушчальна ўвогуле... што наш зямны шар з арбіты можа сарваць і мы паляцім невядома куды. Прымяненне ядзернай зброі недапушчальна», — адназначна падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён прапанаваў спытаць у кіраўніцтва Расіі: можа Расія прымяніць ядзерную зброю ці не. Прэзідэнт толькі адзначыў, што хутчэй за ўсё Уладзімір Пуцін не хоча глабальнага сутыкнення з НАТА. Ён заключыў: «Скарыстайцеся гэтым і зрабіце ўсё, каб гэтага не было».

Разважаючы, ці хоча ўкраінскае кіраўніцтва спыніць баявыя дзеянні ў краіне, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што, магчыма, кіраўніцтва Украіны і хоча гэта зрабіць, але не можа. «Не можа па адной прычыне: таму што сёння не Зяленскі кіруе Украінай, хай ён на мяне не крыўдзіцца, гэта мой пункт гледжання. Калі толькі Джо Байдэн скажа: «Усё, мужыкі, паваявалі, па-руску кажучы, морду адзін аднаму набілі — давайце спыняйце. Вайна нікому не патрэбна, яна нявыгадная», — на працягу тыдня ўсё спыніцца», — растлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ЗША, прышпіліўшы да сябе саюзнікаў, жадаюць утапіць Расію ў вайне ва Украіне. «Гэта іх мэта: трэба разабрацца з Расіяй, потым з Кітаем», — падкрэсліў ён.

Іан Філіпс пацікавіўся, якія адносіны Аляксандра Лукашэнка з яго расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, наколькі сумленна і адкрыта размаўляюць прэзідэнты. «Я сумняваюся, што ва Уладзіміра Пуціна ёсць больш цесныя, адкрытыя і дружалюбныя адносіны з кім-небудзь з сусветных лідараў, чым з Прэзідэнтам Беларусі», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама дадаў, што аб усім гаворыць Уладзіміру Пуціну прама, у лоб, як старэйшаму брату. Зразумела, не дапушчаючы пры гэтым нахабства ці хамства. «У нас добрыя з ім адносіны, самыя лепшыя адносіны, якія толькі могуць быць паміж кіраўнікамі незалежных дзяржаў», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### Адкрытыя адказы на шырокае кола пытанняў

Пасля размовы з кіраўніком дзяржавы Іан Філіпс падзяліўся сваімі ўражаннямі з беларускімі калегамі. Ён падкрэсліў, што гэта была адкрытая размова, падчас якой Аляксандр Лукашэнка адказаў на шырокае кола пытанняў.

«Мы змаглі абмеркаваць шырокі спектр тэм: ад унутранай сітуацыі ў Беларусі да гарачых міжнародных пытанняў. Безумоўна, нашы думкі не заўсёды супадалі. Але для нас важна мець магчымасць пачуць пазіцыю ўсіх бакоў».

Блізкая ўлада

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **7 мая,** з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАЛЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатольеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Урок памяці

# «НЯМА НІЧОГА БОЛЬШ ВАЖНАГА, ЧЫМ МІР І СПАКОЙ»

## Наталля Качанава правяла Урок памяці ў сталічнай гімназіі № 31

**Перад гэтым Старшыня Савета Рэспублікі азнаёмілася з экспазіцыяй школьнага музея, прысвечанай аднаму з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі Кірылу Мазураву, наведала турыстычнае агенцтва гімназіі «Акадэмія падарожжаў», а таксама ўбачыла найбольш цікавыя экспанаты ў этнаграфічным кабінеце-музеі «Народны побыт Беларусі». Аб тым, чым па праве ганарыцца навучальная ўстанова, расказвалі не толькі настаўнікі, але і навучэнцы гімназіі.**

Менавіта яны — маладыя, актыўныя, жыццярадасныя — прадэманстравалі падчас Урока памяці, чаму сёння як ніколі важна гаварыць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і чаму трэба берагчы памяць аб іх. Сучаснае пакаленне беларусаў добра ўсведамляе, што менавіта на іх ляжыць адказнасць за будучыню сваёй краіны. У гэтым кантэксце вельмі сімвалічная назва Урока памяці, прысвечанага 77-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — «Нам гэты мір завешчана берагчы».

— Для кожнага чалавека няма нічога больш важнага, чым мір і спакой, — сказала Наталля Качанава. — І сучасны свет паказвае, што гэта актуальна. Зберагчы і захаваць мір у сваёй краіне вельмі важна. Па-мойму, сёння няма больш важнага пытання для нас усіх. Сімвалічна, што мы разам з дзецьмі абмяркоўваем гэтыя пытанні напярэдадні такога вялікага свята — Дня Перамогі, якое ў найбліжэйшыя дні будзем адзначаць. Гэтае свята дазваляе нам яшчэ раз успомніць аб тых, хто не дажыў да гэтага светлага дня, хто сёння побач з намі, хоць гэтая памяць заўсёды ў нашых сэрцах.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на тым, што вельмі важна, каб гэтая памяць была ў сэрцах маладых хлопцаў і дзяўчат, якія сёння жывуць у дастаткова паспяховай і мірнай краіне, дзе спакой, чысціня, дзе створаны ўсе ўмовы для таго, каб малады чалавек змог сябе рэалізаваць. «Аднак трэба разумець, як няпроста даецца падтрыманне міру і спакою, тое, што зрабілі папярэднія пакаленні для развіцця нашай краіны, — заўважыла Наталля Качанава. — У нас ёсць усё для таго, каб жыць, радавацца жыццю. Мы павінны перадаць гэта маладым людзям, што за ўсім гэтым — праца шматлікіх пакаленняў людзей, якія працавалі і жылі да нас».

У другую нядзелю мая ў краіне ўжо некалькі гадоў як адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Сёлета ён будзе адзначацца акурат напярэдадні Дня Перамогі — 8 мая. Наталля Качанава назвала сімвалічным тое, што гэтыя два святы практычна праходзяць адначасова. «Герб і сцяг — сімвалы нашай краіны, якія мы павінны берагчы, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Пад сцягамі людзі ішлі ў бой, гінулі, і мы павінны гэтымі сімваламі ганарыцца. Яны павінны быць у нашых сэрцах. І горка, калі бачыш, што сцяг, нават маленькі сцяжок, які прадаецца сёння як сімвал нашай дзяржаўнасці, можа валяцца пад нагамі. Такога быць не павінна! Гэта наша краіна, гісторыя, усё тое, аб чым мы гаворым у сувязі з захаваннем нашай гістарычнай памяці. Мы павінны шанаваць і паважаць нашы дзяржаўныя сімвалы».

Не застаецца раўнадушнай Наталля Качанава і да таго, што ў суседніх краінах зносяць помнікі, якія сімвалізуюць Перамогу савецкага народа ў Другой сусветнай вайне. «У маёй свядомасці гэта не ўкладваецца, — кажа спікер верхняй палаты. — Так быць не павінна! Людзі ваявалі, адстаялі свабоду, незалежнасць, столькі людзей загінула... Прычым гінулі не толькі тыя, хто ваяваў са зброяй у руках, але і ні ў чым не вінаватыя мірныя жыхары: дзеці, старыя... І як сёння забыць гэта ўсё?! У людзей, якія не памятаюць і не шануюць свайго мінулага, няма светлай будучыні. І ў той краіны, дзе такое адбываецца, яе няма. Нельга затаптаць у бруд светлую памяць людзей, якія зрабілі для цябе многае, адстаяўшы мір і свабоду».

Падчас Урока памяці Наталля Качанава была максімальна ўключана ў дыялог, адказала і на пытанні навучэнцаў гімназіі. Пры гэтым папрасіла быць шчырымі і пытаць пра тое, што іх сапраўды цікавіць. Школьнікі, у сваю чаргу, папрасілі спікера верхняй палаты парламента падзяліцца ўражаннямі пасля наведвання школьнага музея, таксама спыталі, аб якой прафесіі Наталля Іванаўна марыла ў дзяцінстве, які прафесійны шлях абрала ў выніку. Па просьбе навучэнцаў гімназіі Старшыня Савета Рэспублікі расказала і аб сваёй сям'і, якая таксама спазнала, што такое вайна.

— У гады вайны бацька жыў у Расіі, маці — у Беларусі, — расказала Наталля Качанава. — Мама дзіцем правяла вайну тут, у акупацыі. Мне пашанцавала: яна жыве і сёння. Я з гэтай вайной у сэрцы вырасла. У бацькі ваявалі браты. Ён быў самы малодшы. Яго брат быў цяжка паранены. У мамы ваяваў яе родны дзядзька, які ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, дайшоў да Берліна. Калі пералічваць усіх сваякоў, якія прымалі ўдзел у гэтай жудаснай вайне, гэта дастаткова вялікая гісторыя. Я ганаруся сваімі сваякамі, увогуле ўсімі тымі, хто прайшоў гэтае жудаснае ліхалецце.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што не можа спакойна гаварыць аб вайне. «Мне так хочацца дастукацца да кожнага маладога чалавека, каб яны шанавалі і памяталі, што перажылі нашы старэйшыя пакаленні, — заўважыла яна. — Не проста шанаваць і памятаць — нават на хвіліначку ўявіць, у якіх нечалавечых умовах праходзіла маладосць, дзяцінства нашага старэйшага пакалення. Тады разумееш, наколькі важна захаваць мір».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## Тым часам

Учора Наталля Качанава наведала таксама ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Івана Васільевіча Сядова.

У шэрагі Савецкай Арміі Іван Васільевіч быў прызваны ў 1944 годзе з горада Чыты. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, залатым медалём Кітайскай Народнай Рэспублікі «За перамогу над Японіяй».

Ветэран ужо 70 гадоў жыве разам са сваёй жонкай Верай Кузьмінічнай, інвалідам 3 групы. Іх адзіны сын загінуў пры аварыі на Байкануры. Ад сацыяльных паслуг ветэран адмаўляецца і аддае перавагу ўсё рабіць сам.

«Мы ганарымся вамі. Вашы прыклады — аснова, падмурак патрыятычнага стаўлення да сваёй краіны. Нам вельмі радасна, што сёння з намі людзі, якія на свае вочы бачылі ўсё гэта, адваявалі мір і свабоду. Паглядзіце, як зараз спрабуюць сказіць, перакроіць факты. Таму так важна, што вы сёння з намі. Сустракаецеся са школьнікамі, — адзначыла Наталля Качанава. — Чым далей жыву, тым у гэта свята — 9 Мая — балюча ў мяне ў душы. Моладзь павінна гэта ўсё ведаць. Адна справа, калі гэта ў кнізе напісана, а іншая справа, калі расказваюць ветэраны. У вас апаленая вайной маладосць. Не было ў вас маладосці практычна».

Іван Васільевіч расказаў, што кожны год прымае ўдзел у святочных мерапрыемствах 9 Мая. І сёлета таксама абавязкова ўскладзе кветкі да манумента Перамогі ў Мінску.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

# «КАЛІ МЫ ЗАБУДЗЕМ МІНУЛАЕ, ТО НЕ ЗМОЖАМ БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка прыняў удзел у патрыятычнай акцыі «Прарыў Перамогі».**

«Захаванне памяці аб тых, хто прынёс нам Перамогу, — наш свяшчэнны абавязак і, вядома, пастаянны абавязак усіх пакаленняў. Нам сёння кажуць, што прыйшоў час забыцца. Але павінна быць справядлівасць. У нас ёсць факты, доказы, як пакутавалі нашы людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І калі мы забудзем мінулае, то не зможам будаваць будучыню. І зноў вернемся ў мінулае. Генацыд беларускага народа — гэта адна з чорных і ганебных старонак найноўшай гісторыі. Мы гэтага больш не павінны дапусціць», — адзначыў спікер у размове з журналістамі.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што беларусам, як нашчадкам пакалення пераможцаў, нельга забывацца, якім коштам была здабытая свабода. «Немагчыма апісаць словамі той жах, які тварылі нацысты і іх памагатыя на нашай зямлі. Фактаў іх зверстваў з кожным днём становіцца ўсё больш, у іх няму тэрміну даўнасці. Жыхары Беларусі ў тыя страшныя часы мелі адзіны правільны выбар — ваяваць за сваё жыццё. Хіба можна такі народ падпарадкаваць сваёй волі?» — задаў рытарычнае пытанне спікер.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што Беларусь таксама сёння перажывае няпросты час. Падзеі ў суседніх краінах, санкцыйны ціск на нашу дзяржаву непазбежна ўплываюць на жыццё народа. Па яго словах, па вялікім рахунку ідзе барацьба за валоданне светам. «І ў гэтай абстаноўцы мы павінны захаваць адзінства нашай нацыі, забяспечыць кансалідацыю ўлад, грамадства. Многае залежыць ад кожнага беларуса, ад яго адказнасці за даручаны ўчастак работы, за сваю сям'ю, краіну», — акцэнтаваў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Напярэдадні свята

# ШЭСЦЕ ПАКАЛЕННЯЎ, АЎТАПРАБЕГ, ФЕЕРВЕРКІ...

## Мінск рыхтуецца да святкавання Дня Перамогі

**Менш як тыдзень засталося да аднаго з найгалоўнейшых свят нашай краіны — Дня Перамогі. Пра тое, якія мерапрыемствы падрыхтавалі сталічныя ўлады да вялікай урачыстасці, расказала начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.**

— Амаль месяц таму, 9 красавіка, распачалася гарадская патрыятычная акцыя «30 дзён да Перамогі», якая адкрыла цыкл урачыстых мерапрыемстваў. Гэтая акцыя ўсё яшчэ актыўна праходзіць на тэрыторыі горада. 6 мая пачнецца перыяд асноўных святкаванняў. У гэты дзень будзе арганізаваны аўтапрабег па знакавых і памятных мясцінах Мінска, які завершыцца памятнымі мітынгамі, прысвечанымі Дню Перамогі.

Таксама 6 мая адбудзецца святочны канцэрт з удзелам майстроў мастацтваў у Палацы Рэспублікі, пачатак а 17.00. Праз два дні, 8 мая, на Плошчы Дзяржаўнага сцяга пройдзе ўшанаванне дзяржаўных сімвалаў. Дадзенае свята праходзіць штогод у другую нядзелю мая, што гэтым разам супала з пярэдаднем Дня Перамогі.

9 мая ў 11.00 у рамках акцыі «Беларусь памятае» адбудзецца «Шэсце пакаленняў» да манумента Перамогі, дзе ўдзельнікі ўскладуць кветкі. Узначаляць калону навучэнцы ваенна-патрыятычных класаў, вучылішчаў і клубаў. Трэба адзначыць, што ўпершыню ўдзел у такім шэсці не будуць браць ветэраны, але яны наведаюць іншыя святочныя пляцоўкі.

Прапаную мінчанам узяць удзел у згаданай акцыі і аддаць даніну павагі тым людзям, якія абаранялі нашу Радзіму падчас Вялікай Айчыннай вайны.

**Начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталь БРЭЛЬ** расказаў, што асноўнай ідэяй гарадскіх мерапрыемстваў стане тэма «Год гістарычнай памяці».

*— Прастора ўздоўж праспекта Пераможцаў будзе падзелена на тры тэматычныя зоны. Каля Палаца спорту з 7 да 9 мая будзе арганізаваны святочны кірмаш, таксама ў асноўны дзень свята там будзе праведзены канцэрт. Другая тэматычная зона напоўніцца ваеннымі квэстамі і кінапляцоўкай. Трэцяя пляцоўка, «Служу Беларусі», размесціцца каля ўвахода ў музей ВАВ, каля яе будуць арганізаваны ваенныя выставы.*

Упрыгажэннем свята Перамогі стане традыцыйны салют, які пройдзе ў некалькіх лакацыях сталіцы: парках Янкі Купалы, М. Паўлава, Уга Чавеса, на набярэжнай у Драздах, каля «Чыжоўка-Арэны».

**Прадстаўнік дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый ШКУРАТАЎ** растлумачыў, што Мінск падрыхтаваны да вялікай колькасці пасажыраў.

— Гарадскі транспарт у перыяд правядзення мерапрыемстваў будзе працаваць па графіку выхаднога дня. Па маршруце асноўных пляцовак ад Палаца спорту да Плошчы Дзяржаўнага сцяга на праспекце Пераможцаў будуць скарочаны інтэрвалы руху з дабаўленнем дадатковых транспартных адзінак.

Паводле слоў **начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алены НАГОРНАЙ,** да падрыхтоўкі святочнага мерапрыемства каля Палаца спорту падключыўся Мінскі аўтамабільны завод.

*— Дзякуючы МАЗу на нашай пляцоўцы будзе выстава машын, розыгрыш прызоў ад каманды «МАЗ-СПОРТ-аўта». У кожным раёне сталіцы будуць працаваць гандлёвыя пляцоўкі, з графікам работы якіх можна азнаёміцца на сайце Мінгарвыканкама.*

Падвёўшы вынікі прэс-канферэнцыі, Вольга Чамаданава звярнулася да мінчан і гасцей сталіцы наконт дадатковых мер засцярогі і праверак.

*— Бяспекі шмат не бывае. Хочацца, каб грамадзяне з разуменнем ставіліся да тых наваўвядзенняў, якія робяцца для іх абароны. Важна, каб у людзей быў святочны настрой, а мерапрыемствы праводзіліся без здарэнняў.*

**Аляксей КАРПУК.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Байдэн і яго адміністрацыя блізкія да таго, каб канчаткова падарваць давер амерыканцаў

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн і яго адміністрацыя небяспечна блізкія да таго, каб беззваротна падарваць давер амерыканскага грамадства да здольнасці ўлад забяспечыць росквіт і фінансавую бяспеку краіны, паведаміў тэлеканал CNN. Вынікі апытання CNN сведчаць, што неаднаразовыя спробы Байдэна зняць з сябе віну за правалы ў эканоміцы не працуюць. Белы дом першапачаткова недаацаніў тую разбуральную сілу, як інфляцыя, і не здолеў яе ўтаймаваць. Дзесяцігоддзямі амерыканцы не бачылі такога дэмаралізуючага росту цэн на асноўныя тавары і паслугі, як цяпер. Апытанне CNN, праведзенае службай SSRS, паказала, што большасць амерыканцаў лічыць: палітыка Байдэна нанесла шкоду эканоміцы ЗША, а 8 з 10 лічаць, што ўрад недастаткова робіць для барацьбы з інфляцыяй. «Так што краіну і асабліва Байдэна чакае яшчэ больш расчараванняў», — адзначае CNN.

### Гадавая інфляцыя ў Турцыі ў красавіку склала амаль 70 працэнтаў

Інфляцыя ў Турцыі ў гадавым вылічэнні ў красавіку бягучага года дасягнула 69,97 працэнта. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на зводкі Турэцкага статыстычнага інстытута (TUIK). У студзені гадавая інфляцыя ў краіне складала 48,69 працэнта, а ў сакавіку гэтага года дадзены паказчык вырас да 61,14 працэнта. Турэцкія СМІ называлі гэты рост 20-гадовым рэкордам. Варта адзначыць, што інфляцыя ў месячным вылічэнні крыху знізілася з 9,19 у сакавіку да 7,67 працэнта ў красавіку. Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган раней заяўляў, што будуць прыкладзены значныя намаганні для зніжэння ўзроўню інфляцыі. Турэцкі лідар разлічвае атрымаць вынікі такой работы ўжо ў бягучым месяцы. Цэнтральны банк краіны ў красавіку павысіў прагноз па інфляцыі на канец 2022 года да 42,8 працэнта з раней прадугледжаных 23,2 працэнта. Нацыянальная валюта Турцыі ў лістападзе мінулага года абвалілася амаль на трэць у параўнанні з пачаткам года.

### На Эверэсце ўстанавілі самую высокую метэастанцыю

Група навуковай экспедыцыі з Інстытута Цінхай-Тыбецкага нагор'я Кітайскай акадэміі навук устанавіла на вышыні 8,8 кіламетра аўтаматычную метэаралагічную станцыю на вяршыні самай высокай гары Эверэст, паведаміла China Times. Адзначаецца, што гэтая метэастанцыя — самая высокая аўтаматычная метэастанцыя ў свеце. Яна павінна замяніць прыладу, пабудаваную брытанскімі і амерыканскімі навукоўцамі на паўднёвым схіле Эверэста ў 2019 годзе. У экспедыцыі ўдзельнічалі 13 чалавек.

Уладзімір ПЯРЦОЎ:

# «Мы нацэлены на тое, каб у першую чаргу даносіць праўду»

**Міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў, кіраўнікі і прадстаўнікі рэспубліканскіх СМІ 5 мая ўсклалі кветкі да стэлы «Мінск — горад-герой».**

Фота БелТА.

«У наша прафесійнае свята і напярэдадні вялікага Дня Перамогі склалася добрая традыцыя: прадстаўнікі найбуйнейшых сродкаў масавай інфармацыі і Міністэрства інфармацыі выязджаюць на адну з памятных мясцін, якія сімвалізуюць Вялікую Перамогу», — сказаў Уладзімір Пярцоў.

Паводле яго слоў, гэтая акцыя — даніна памяці тым, хто аддаў свае жыцці за тое, каб мы жылі пад мірным небам. «Каб мы маглі будаваць сваю краіну, маглі жыць без нягод, нейкага цяжару і ўсіх тых жахаў, якія нам былі запланаваны тымі, хто прыйшоў з Захаду з фашысцкай ідэалогіяй на нашу зямлю і знішчыў трэць нашага насельніцтва».

Уладзімір Пярцоў адзначыў, што неабходна захаваць для нашых нашчадкаў праўду пра Вялікую Айчынную вайну.

«У барацьбе з любымі фэйкамі праўда — галоўная зброя. І нашы журналісты нацэлены на тое, каб даносіць праўду, — сказаў Уладзімір Пярцоў. — Цяпер вялікую работу выканала Генеральная пракуратура, дакументуючы тыя зверствы, якія былі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўчынены над беларускім народам, над мірнымі людзьмі, жанчынамі, старымі, дзецьмі — тымі, хто быў знішчаны, спалены, закапаны практычна жыўцом. Гэта ўсё дакументуецца».

Міністр падкрэсліў: «Нам з вамі, журналістам друкаваных і электронных СМІ, трэба ўсіх жывых сведкаў той вайны — ветэранаў, малалетніх вязняў — запісваць. Запісваць іх гісторыі на тэлекамеры, каб нашым нашчадкам паказваць праўду. І калі ў нашых апанентаў будуць спробы гэтую праўду перавярнуць — мы будзем паказваць першакрыніцу, расповеды, дакументальную хроніку, раскопкі тых жахаў і зверстваў, якія рабіліся на нашай зямлі».

# У «ЗВЯЗДЫ» З'ЯВІЛАСЯ ЯШЧЭ АДНО «ЗАЛАТОЕ ПЯРО»

**У Беларускім саюзе журналістаў адзначылі лаўрэатаў прэміі «Залатое пяро». Гэта стала своеасаблівым падарункам да Дня друку, які традыцыйна адзначаецца 5 мая. Сярод лаўрэатаў і аглядальнік «Звязды» Валерыя СЦЯЦКО. Наша калега стала лаўрэатам прэміі ў намінацыі за найлепшую работу ў мастацка-публіцыстычных жанрах.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як адзначыў **старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ,** за апошнія два гады беларуская журналістыка зрабіла вялікі крок наперад: ствараюцца медыяхолдынгі, журналісты прысутнічаюць ва ўсіх сферах. «Але самае важнае, што ў нас з'явілася яскравая, эмацыянальная, якасная аўтарская журналістыка і публіцыстыка. Цяпер гэта запыт часу, аўдыторыя просіць ад нас грамадзянскую пазіцыю, аўдыторыя просіць эмоцыі, яна просіць перадаць сутнасць і нервы часу. Мне здаецца, што нашы калегі, якія сёння атрымалі прэмію Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», якраз і з'яўляюцца тым самым касцяком патрыятычнай, яркай, эмацыянальнай этычнай тонкай журналістыкі», — сказаў ён.

# «ВАГІ» ДЛЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пасля змен у Жыллёвым кодэксе ў 2003 годзе адказнасць за эксплуатацыйныя характарыстыкі прылад уліку і іх замену перад правядзеннем капрамонту перайшла да ўласнікаў электронных прыбораў. Такім чынам, атрымалася два тыпы абанентаў. Прылады адных (старыя) абслугоўвала энергазабяспечвальная арганізацыя, а ўладальнікі электронных лічыльнікаў мусілі ўжо самі несці затраты па іх абслугоўванні.

Аднак жыхары пачалі скардзіцца на такі неаднолькавы падыход. І Мінэнерга вырашыла за свой кошт аснасціць усе шматкватэрныя дамы электроннымі (статычнымі) прыладамі ўліку. Была прынята праграма мадэрнізацыі сродкаў разліковага ўліку з тэрмінам выканання да канца 2023-га, падзяліўся Віктар Жыткевіч:

— На момант падпісання праграмы налічвалася 4 млн 564 тысячы ўстаноўленых аднафазных (індукцыйных) лічыльнікаў энергіі, сярод якіх толькі 23,8 % былі электроннымі. Такім чынам, трэба было памяняць 3,5 млн індукцыйных лічыльнікаў. Цяпер заменена 2 млн 548 тысяч (80,7 % ад запланаванага), у тым ліку летась — 496,8 тысячы. Найперш мы стараемся мяняць лічыльнікі ў дамах, дзе запланаваны капрамонт, і рабіць гэта паралельна з ім. Кошт адной прылады, дарэчы, — 120—160 рублёў.

Электронныя лічыльнікі маюць больш высокі клас дакладнасці, чым індукцыйныя, — 1, то-бок працэнт іх пагрэшнасці ў 2,5 раза меншы. Гэтыя прылады ўмеюць назапашваць інфармацыю, што дазваляе счытаць архіў іх паказчыкаў за год. Лічыльнікі абаронены ад знешняга ўмяшання, што памяншае крадзяжы электраэнергіі.

## Тарыфнае меню па часе і сезоне

Сёння для грамадзян створана прывабнае тарыфнае меню, у якім чалавек можа выбраць найлепшы для сябе варыянт аплаты. Раней памер тарыфаў залежаў ад таго, усталявана ў чалавека электрычная пліта ці газавая. **Для кватэр з электраплітамі** кошт быў на 15 % меншы, чым для жылля, абсталяванага газам, — па 19,73 капейкі 1 кВт•г. **Для кватэр з газам** — па 23,21 капейкі, абазначыў Віктар Жыткевіч.

Цяпер у гэтых тарыфных групах прадугледжаны часовыя перыяды. **У двухзонным тарыфе з электраплітамі** ёсць так званы начны варыянт, калі на энергасістэму прыходзяцца мінімальныя нагрузкі (з 22.00 да 17.00 — 13,81 капейкі за 1 кВт•г) і час з 17.00 да 22.00 — 39,46 капейкі за 1 кВт•г. **У трохзонным тарыфе з электраплітамі**

абазначаны час і кошт мінімальных нагрузак (з 23.00 да 6.00 — па 11,84 капейкі за 1 кВт•г), максімальных нагрузак (з 17.00 да 23.00 — 35,51 капейкі за 1 кВт•г) і астатні час (па 13,81 капейкі за 1 кВт•г).

**Двухзонны тарыф у жыллі з газавымі плітамі** адпаведна складае 16,25 капейкі за 1 кВт•г з 22.00 да 17.00 і самы вялікі на сёння кошт — 46,42 капейкі за 1 кВт•г з 17.00 да 22.00. **Трохзонны тарыф з газавымі плітамі** падзяляецца на мінімальныя нагрузкі з 23.00 да 6.00 — 13,93 капейкі за 1 кВт•г. Максімальныя — з 17.00 да 23.00 — 41,78 капейкі за 1 кВт•г. І астатні час — 16,25 капейкі за 1 кВт•г.

**У дамах,** якія не абсталяваны сістэмамі цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння і **дзе электрычнасць выкарыстоўваецца на ацяпленне і падагрэў вады і ёсць асобная дадатковая прылада індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі для патрэб ацяплення і падагрэву вады,** прымяняецца сезонны тарыф. З 1 студзеня па 31 мая — 3,98 капейкі за 1 кВт•г, а з 1 чэрвеня па 31 снежня — 4,33 капейкі за 1 кВт•г.

**Там, дзе асобнай прылады няма,** жыхары могуць плаціць па адпаведным тарыфе — 9,81 капейкі за 1 кВт•г з 1 студзеня па 31 мая і 10,03 капейкі за 1 кВт•г з 1 чэрвеня па 31 снежня. А могуць выбраць дыферэнцыраваны па часе сутак. З 1 студзеня па 31 мая з 23.00 да 6.00 — 6,87 капейкі за 1 кВт•г, у астатні час сутак — 12,75 капейкі за 1 кВт•г. А з 1 чэрвеня па 31 снежня электрычнасць каштуе 7,02 капейкі за 1 кВт•г з 23.00 да 6.00 і 13,04 капейкі за 1 кВт•г у астатні час сутак.

— У залежнасці ад звычак жыхар можа выбраць свой тарыф, аднак адчувальную эканомію заўважаць хіба што жыхары індывідуальных дамоў. Ды і тое, толькі калі яны спажываюць штомесяц не менш як 300 кВт і карыстаюцца электраэнергіяй у часы мінімальных тарыфаў. Для тых, каму хапае 50 кВт на месяц, сэнсу пераходзіць на нейкі тарыф няма, — падкрэсліў Віктар Жыткевіч. — Чалавек мусіць прыйсці ў энергазабяспечвальную арганізацыю і напісаць заяву. Пасля спецыялісты бясплатна перапраграмуюць лічыльнік. Жыхары, у якіх яшчэ ўсталяваны індукцыйны лічыльнік, што тэхнічна не дазваляе вылучыць часовыя зоны, не змогуць выбраць сабе тарыф нават пры жаданні, пакуль прыладу не заменяць электроннай.

## Анлайн і дыстанцыйна

У індукцыйных лічыльніках (ды і ў электронных, якія не ўключаны ў аўтаматызаваную сістэму, а значыць, не могуць дыстанцыйна перадаваць звесткі пра ўжытую жыхаром электрычнасць) чалавек павінен сам глядзець на паказчыкі прылады, запісваць колькасць ужытых энергарэсурсаў і аплачваць іх. Укараненне сістэмы, на думку спецыяліста «Белэнерга», дазваляе кантраляваць энергаспажыванне і аўтаматычна здымаць паказчыкі энергіі з лічыльнікаў.

— Да 2025 года ва ўсіх дамах, якія ўжо абсталяваны новымі лічыльнікамі, такая сістэма будзе зроблена за кошт «Белэнерга». Сёння ў краіне створана 21 355 аўтаматызаваных сістэм, якія аб'ядноўваюць 1 млн 850 тысяч абанентаў. У новым індывідуальным жыллі лічыльнікі таксама злучаюць у сістэму. А Мінжылкамгас сумесна з Мінсувязі працуюць над тым, каб гэтая сістэма вяла кантроль і ўлік усіх відаў энергарэсурсаў, якія ёсць у доме: вада, газ, цяпло і электрычнасць, — абазначыў Віктар Жыткевіч. — У кожнай вобласці краіны ёсць эксперыментальныя раёны, дзе дамы аб'яднаны такім чынам. Аднак у маленькіх вёсках, зразумела, рабіць дыстанцыйнае здыманне паказчыкаў не будуць, бо гэта эканамічна немэтазгодна.

Падчас аўтаматычнага рэжыму кантралююцца перадача колькасці энерганосьбіту і яго аплата. У рэжыме анлайн можна счыць, колькі электрычнасці ўжывае пэўная кватэра ў любы час. Пасля заканчэння разліковага перыяду звесткі на 00.00 гадзін першага чысла месяца, які настае за разліковым, інфармацыя з лічыльнікаў перадаецца ў АРІП:

— У аўтаматызаванай сістэме ўказваецца, колькі электрычнасці ўжыў чалавек (напрыклад, 10 кВт), а ён піша толькі 5 кВт. Аднак пры аплаце ён уводзіць свае персанальныя даныя ў сістэму, і мы можам бачыць, хто недаплаціў за ўжытае. Потым мы можам адправіць да яго нашага кантралёра, які складзе адпаведны акт, зробіць кантрольную здымку паказчыкаў і папярэдзіць нядобрасумленнага абанента. Калі чалавек не плаціць два месяцы, святло яму можна адключаць (папярэдне паведамляюць пра доўг пісьмова).

## Што лічыльнік паказвае?

Згодна з Правіламі энергазабеспячэння, адказнасць за захаванасць і цэласнасць сродкаў разліковага ўліку (вымяральныя трансфарматары току, лічыльнікі, прыборы збору і перадачы даных, каналы сувязі ў межах аб'екта электразабеспячэння і іншыя прылады бесправадной сувязі для дыстанцыйнай перадачы звестак), а таксама пломбаў на прыладах ляжыць на жыхарах ці індывідуальных прадпрымальніках, якія валодаюць пералічанымі прыладамі.

У шматкватэрных дамах за наяўнасць і спраўнасць замыкаючых прылад на групавых паверхавых электрашчытках адказваюць абслуговыя жыллёва-камунальныя службы. А вось эксплуатацыя і рамонт лічыльнікаў — справа энергетыкаў.

— Канструкцыя сучасных шчыткоў дазваляе грамадзянам пры неабходнасці адключыць свята ў кватэры. Дастаткова адкрыць зашчапку і крыху прыўзняць сценку шчытка — тумблеры можна будзе пераключаць. А вось да самога лічыльніка дабрацца будзе нельга, — патлумачыў спецыяліст. — Што датычыцца лічыльнікаў у прыватных дамах, якія павінны знаходзіцца звонку жылля ў вынасных шафах уліку: калі індукцыйны лічыльнік заменены электронным унутры дома, то патрабаваць выносіць яго на вуліцу ніхто не будзе.

На табло электроннага лічыльніка можна ўбачыць некалькі паказчыкаў: час, бягучую імгненную магутнасць (колькі кілават ужываецца ў кватэры непасрэдна цяпер у кВт•г) і лічбы колькасці ўжытай энергіі ў кВт.

Ці працуе лічыльнік, жыхар можа паглядзець сам (як мінімум раз на месяц, калі здымае лічбы для аплаты). Калі лічбы не мяняюцца — варта клікаць спецыялістаў. А вось прылады, якія ўключаны ў аўтаматызаваную сістэму, могуць самі сябе абслугоўваць: і даныя перадаваць дыстанцыйна, і, калі сапсуюцца, энергетыкі гэта адразу ўбачаць, бо лічыльнік перастане дасылаць звесткі пра ўжытыя кілаваты.

— Здараецца, пры аплаце чалавек уводзіць не тыя лічбы і пераплачвае. Каб вярнуць грошы ці папрасіць залічыць іх у кошт будучых плацяжоў, ён павінен прыйсці да энергетыкаў і напісаць заяву, — удакладніў Віктар Жыткевіч.

На час рамонту, які, дарэчы, аплачвае жыхар, яму дадуць на падмену часовы лічыльнік. Праз восем гадоў пасля ўстаноўкі прылады тэрмін яе дзеяння заканчваецца, і за замену таксама плаціць уласнік. Аднак падчас паверкі лічыльніка, калі ён у парадку, энергетыкі могуць прадоўжыць яго афіцыйнае жыццё яшчэ на 16 гадоў. У планах спецыялістаў — зрабіць міжпаверачны інтэрвал адразу 16 гадоў замест васьмі, пасля чаго лічыльнік абавязкова трэба будзе мяняць.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# Надзейная сувязь для ветэранаў ВАВ — з тарыфным планам «Перамога» ад А1

**Дзень Перамогі — нагода яшчэ раз аддаць належнае ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Сваю павагу да іх подзвігу і заслуг грамадства імкнецца выказваць усімі даступнымі спосабамі, у тым ліку клопатам аб іх дабрабыце і дапамогай у вырашэнні надзённых пытанняў. Унёскам кампаніі А1 у гэты працэс з'яўляецца спецыяльны тарыфны план ад А1 «Перамога», прызначаны для ветэранаў і інвалідаў ВАВ.**

Тарыфны план **«Перамога»** дапамагае ветэранам карыстацца ўсімі сучаснымі паслугамі сувязі і падтрымліваць кантакты са сваім асяроддзем. Ён уключае неабмежаваны час размоў унутры сеткі А1, 100 хвілін на нумары іншых беларускіх аператараў, у тым ліку гарадскія, 500 МБ інтэрнэт-трафіку. Пры гэтым абаненцкая плата тарыфнага плана **«Перамога»** складае ўсяго 1,06 рубля ў месяц.

Падключыць тарыфны план «Перамога» або перайсці на яго ветэраны могуць асабіста або праз даверануую асобу. Для афармлення абаненцкага дагавора патрэбны пашпарт і пасведчанне ўдзельніка ВАВ. Зручным спосабам падключэння з'яўляецца анлайн-зварот праз афіцыйную інтэрнэт-краму А1. У гэтым выпадку SIM-карта з падключаным тарыфным планам будзе дастаўлена на ўказаны адрас бясплатна. На адно пасведчанне можна аформіць адзін абаненцкі нумар з падключаным тарыфным планам **«Перамога».**

УНП 101528843


Надвор'е

# УНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ ДА МІНУС 3 ГРАДУСАЎ, А ПОТЫМ ПАЦЯПЛЕННЕ

**Вось і май. Апошні месяц вясны ў нас бывае досыць цёплы. Але ў той жа час у першай палове мая начныя замаразкі цалкам магчымыя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Аб істотных замаразках надвор'е нам нагадае ўжо ў найбліжэйшую ноч. У пятніцу пераважна без ападкаў. Мінімальная тэмпература паветра ўночы складзе ад плюс 1 градуса да 6 цяпла, месцамі замаразкі — ад нуля да мінус 3 градусаў, па захадзе Беларусі да плюс 9. Максімальная тэмпература ўдзень чакаецца ад плюс 15 градусаў да 21 градуса вышэй за нуль. Атмасферны ціск уночы істотна не зменіцца, удзень будзе слаба падаць.

У суботу, 7 мая, надвор'е будзе вызначаць маларухомая франтальная сістэма. Воблачна з праясненнямі. Уночы пераважна па захадзе, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ўночы ад 3 да 10 цяпла, максімальная ўдзень — ад плюс 13 да плюс 20 градусаў.

У нядзелю краіна апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, якія ідуць з Балтыйскага мора. Будзе воблачна з праясненнямі. Уночы месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі нашага рэгіёна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ўночы 4—10 цяпла, максімальная ўдзень — плюс 12—18 градусаў, месцамі па краіне да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НЕВЯДОМАЕ ПРА ВЯДОМЫХ

**Калі для некаторых творцаў тэма Вялікай Айчыннай вайны была і застаецца сферай мастацкага і дакументальнага даследавання, то для іншых гэта неад'емная рэальная частка іх біяграфіі. Пра такіх людзей і распавядае дакументальная кінастужка «Зоркі кіно. Яны змагаліся за Радзіму», якую пакажуць 7 і 8 мая ў эфіры тэлеканала АНТ.**

Мы добра ведаем і любім гэтых асоб па ролях у кіно, але мала каму вядома ў падрабязнасцях, праз якія жыццёвыя выпрабаванні ім давялося прайсці. У двух фільмах стваральнікі распавядаюць пра пакаленне артыстаў, чыя маладосць прыпала на вайну і якія разам з краінай праходзілі франтавымі дарогамі праз боль, кроў, страты і трагедыі. Так, напрыклад, Юрыя Нікуліна большасць сучасных гледачоў ведае па камедыйных ролях. Шмат гадоў ён кіраваў Маскоўскім цыркам і здымаўся ў гумарыстычных перадачах. Аднак разам з тым акцёр прайшоў дзве вайны — яго прызвалі ў армію перад «фінскай», і ўсю Вялікую Айчынную ён правёў на фронце — спачатку ў ракетна-зенітным батальёне, а потым як камандзір разведкі. І калі ў фільме «Брыльянтавая рука» яго герой прамаўляе: «З вайны не трымаў баявой зброі», то кажа гэта Нікулін пра самога сябе.

Анатоль Папанаў, Аляксей Смірноў, Інакенцій Смактуноўскі, Леанід Гайдай і многія іншыя маюць у сваёй біяграфіі радкі, пра якія не любілі ўспамінаць. Таму што кожны з іх ведаў, якім было жыццё на вайне, і кожны з іх зрабіў свой уклад у агульную Перамогу... Калі хочаце даведацца пра гэта больш, не прапусціце дзве часткі дакументальнага фільма на АНТ.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 145

**Задача ад нашага чытача Міхаіла Кошаля адзначана другім спецыяльным пачэсным водгукам за мініяцюру ў конкурсе газеты «Вечерний Санкт-Петербург» (*гл. дыяграму*).**

**Белыя:** Крe2, Фh1, Cb6, Сc8, Ка5, пh6 (6).

**Чорныя:** Крe5 (1).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

Пецярбургскі конкурс выдаўся «ўраджайным» на ўзнагароды для беларускіх складальнікаў. Мы яшчэ вернемся да гэтай тэмы.

* * *

Фінішавалі першынствы Беларусі да 20 гадоў. У юніёраў сярод 12 удзельнікаў было 2 міжнародныя майстры і 5 майстроў ФІДЭ. Перамог міжнародны майстар Дзяніс Лазавік — 9,5 бала з 11. На другім месцы — міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі (9), на трэцім — майстар ФІДЭ Максім Царук (8).

Міхей Навуменка — Дзяніс Лазавік. 1. d4 Kf6 2. Kf3 d5 3. c4 e6 4. g3 Cb4+ 5. Kbd2 0-0 6. Cg2 b6 7. 0-0 Cb7 8. a3 Ce7 9. b4 a5 10. ba Л:a5 11. a4 Kbd7 12. cd C:d5 13. Фc2 Фa8 14. Cb2 c5 15. Kc4 Лa6 16. Ke3 Ce4 17. Фb3 cd 18. C:d4 Kc5 19. C:c5 C:c5 20. Kd2 C:g2 21. K:g2 Лd8 22. Kc4 Ke4 23. Kf4 h6 24. Фf3 b5 25. Ke5 Cd4 26. Лad1 Лad6 27. K:f7 Кр:f7 28. Kd5+ Kf6 29. K:f6 Ф:f3, 0:1.

Арцём Сіняўскі — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 c5 4. dc e6 5. Ce3 Kd7 6. Kc3 Ke7 7. f4 Kf5 8. Cf2 C:c5 9. Фd2 Фb6 10. C:c5 K:c5 11. Cd3 d4 12. Kd1 K:d3+ 13. Ф:d3 Cd7 14. a4 Kh4 15. Ke2 Cc6 16. Kpf2 Лd8 17. Лg1 0-0 18. Kpg3 Kf5+ 19. Kph3 f6 20. g4 Ke7 21. ef Л:f6 22. g5 Лf5 23. Kf2 Kg6 24. Kg4 Л:f4 25. Лaf1 Лe4 26. Лg3 Фa5 27. Лg2 Kph8, 0:1.

У дзяўчат з 12 удзельніц тры мелі званне майстра ФІДЭ. Яны і занялі прызавыя месцы: 1) Аляксандра Тарасенка; 2) Ксенія Зелянцова; 3) Варвара Палякова. Дарэчы, у першым жа туры Аляксандра перайграла Ксенію.

Мілена Шахазізян — Аляксандра Тарасенка. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 c5 4. d5 ed 5. cd d6 6. g3 g6 7. Cg2 Cg7 8. Kf3 0-0 9. 0-0 Лe8 10. Kd2 Kbd7 11. h3 a6 12. a4 Лb8 13. Kc4 Ke5 14. Ka3 b5 15. ab ab 16. Ka:b5 Фb6 17. Ka3 Ca6 18. Лb1 Kfd7 19. Ce3 Фb3 20. Ke4 Ф:d1 21. Лf:d1 Лb6 22. Лd2 Лeb8 23. Лc2 f5 24. Kd2 C:e2 25. Cf1 Cd3 26. C:d3 K:d3 27. Kdc4 Лb3 28. Cf4 K:f4 29. gf Kf6 30. Крg2 K:d5, 0:1.

Лізавета Ляшкевіч — Ксенія Зелянцова. 1. d4 d6 2. c4 e5 3. Kf3 e4 4. Kfd2 f5 5. Kc3 Kf6 6. e3 Ce7 7. Фc2 c6 8. d5 0-0 9. Ce2 Ka6 10. f3 cd 11. K:d5 K:d5 12. cd Фb6 13. Kc4 Фc5 14. Cd2 ef 15. C:f3 Cg5 16. Фc3 Лe8 17. 0-0 Cd7 18. b4 Фc7 19. Фb3 b5 20. Ka3 Фb6 21. Kc2 f4 22. Cc3 Cf5 23. Cd4 Фc7 24. Лac1 Лac8 25. e4 C:e4 26. C:e4 Л:e4 27. Фd3 Фe7 28. Ф:b5 Kc7 29. Фd3 K:d5 30. C:a7 Ф:a7+ 31. Kph1 Kf6 32. Ф:d6 Лec4 33. Фe6+ Фf7 34. Фe2 f3, 0:1.

* * *

Адкрытае першынство Магілёва (57 удзельнікаў) выйграў Аляксей Андрасюк.

У Брэсце прайшоў традыцыйны фестываль «Чорная пешка». У «дарослым» турніры па хуткіх шахматах перамаглі Аляксандр Алішэвіч і Аляксандра Тарасенка, па бліцы — Антон Шарамет і Аляксандра Тарасенка. У праграме было таксама шмат дзіцячых турніраў, спаборніцтвы па шахматах Фішара, шахматных паддаўках, супербліцы, шашках, рашэнні задач і красвордаў і г. д., нават па шахматах навобмацак.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Ka3 (2. Лb2) Крc1 2. Лe2. Блізня: 1. Лb2 Крc1 2. Kd3+. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Уладзімір Ізотаў, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цялыпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Сядзі і глядзі

# КІНАСВЕДЧАННІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

**Кінафільмы, якія распавядаюць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, заўсёды нагадваюць пра галоўнае: што жыццё — найвялікшая каштоўнасць, што гераізм незалежна ад яго маштабаў ёсць адзнака чалавечнасці і сілы... Напярэдадні і ў Дзень Перамогі прапаноўваем паглядзець ваеннае кіно, каб згадаць той няпросты і лёсавызначальны час і людзей, дзякуючы якім мы сёння маем мірнае неба над галавой.**

На «Беларусь 2» сярод кінастужак ваеннай тэматыкі варта звярнуць увагу на героіка-прыгодніцкі фільм Юрыя Бяржыцкага «Вам — заданне» (2004 г.). Ваенная драма прысвечана гераічным і суровым падзеям. Дзеянне карціны пачынаецца вясной 1941-га і завяршаецца першымі месяцамі пасля вызвалення Беларусі, а ў цэнтры сюжэта — гісторыя трох братоў Купрэвічаў. Тут ёсць усё: і складаныя лёсы, і гераічныя ўчынкі, і сапраўдныя пачуцці, і ўменне верыць нягледзячы ні на што... Не прапусціце паказ кінастужкі ў суботу днём.

Увечары тут пакажуць беларуска-расійскую драму «Брэсцкая крэпасць» (рэжысёр Аляксандр Кот, 2010 г.). Сюжэт фільма вяртае нас у часы гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці, якая прыняла на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў 22 чэрвеня 1941 года. Падзеі ўсяго, што адбывалася там, гледачы бачаць вачыма героя фільма Сашкі Акімава (прататыпам якога стаў 15-гадовы Пеця Клыпа, адзін з ацалелых абаронцаў крэпасці).

У нядзелю 8 мая рэкамендуем паглядзець ваенную драму «Радзіма або смерць» (2007 г.) рэжысёра Алы Крыніцынай. Фільм расказвае пра групу дыверсантаў, якую стварыў вораг, выкарыстаўшы дзяцей з дзіцячага дома, каб рэалізаваць свае планы па разбурэнні чыгуначных пуцей. Але раптам усё пойдзе не па плане і пастане пытанне, ці спраўдзяцца намеры захопнікаў...

На тэлеканале «НТБ-Беларусь» у суботу чакаем паказ фільма Міхаіла Пташука «У жніўні 44-га», а ў панядзелак — ваенна-гістарычную драму Канстанціна Фама «Сведкі». Апошні расказвае гісторыю Халакосту вачыма нямых сведкаў тых падзей і складаецца з трох навэл: «Чаравічкі» (2012 г.), «Брут» (2016 г.) і «Скрыпка» (2017 г.). Здымкі праекта вяліся на працягу пяці гадоў на тэрыторыі 9 краін — Расіі, Беларусі, Чэхіі, Польшчы, Францыі, ЗША, Ізраіля, Украіны і Румыніі.

Сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» таксама прапануе сваім гледачам шэраг адметных і цікавых кінастужак ваеннай тэматыкі, сярод якіх «Гарачы снег» (1972 г.) Гаўрыіла Елізарава, «Яны змагаліся за Радзіму» (1975 г.) Сяргея Бандарчука, «У небе «начныя ведзьмы» (1981 г.) Яўгеніі Жыгуленкі, «Жэня, Жэнечка і «кацюша» (1967 г.) Уладзіміра Матыля і іншыя. У суботу на «Беларусь-3» адбудзецца паказ ваеннай кінааповесці «Чаклун і Румба» рэжысёра Андрэя Голубева. Дзеянне карціны адбываецца ў 1944—1945 гадах у Прусіі, а ў цэнтры ўвагі — франтавы лёс аднаго з мільёнаў салдат Вялікай Айчыннай вайны, сапёра Фёдара Чаклуна, і яго чатырохногага сябра — аўчаркі Румбы.

А вось героіка-прыгодніцкая кінастужка «Сын палка» (1981 г.) рэжысёра Георгія Кузняцова расказвае пра 12-гадовага хлопчыка, якога разведчыкі артылерыйскага палка знаходзяць падчас рэйду. Аказваецца, што дзіця жыве само па сабе ўжо два гады, і мужчыны прымаюць рашэнне забраць яго і адправіць у тыл. Але хлопец па дарозе ў горад збягае і зноў вяртаецца да разведчыкаў. Камандзір, прыкіпеўшы да малога душой, вырашае ўсынавіць яго. А пасля яго смерці шэфства над хлопчыкам бяруць на сябе аднапалчане. Не прапусціце паказ у суботу вечарам ці ў панядзелак на «Беларусь 3».

На «Беларусь 1» будзе магчымасць не толькі паглядзець кіно, але і паназіраць за мерапрыемствамі святкавання 9 Мая ў эфіры інфармацыйнага канала «Дзень Перамогі». Тут плануюцца паказ тэлефільма «Таемныя сцяжынкі», трансляцыя цырымоніі ўскладання кветак да манумента Перамогі, прамыя ўключэнні і спецрэпартажы, а вечарам — гала-канцэрт «Памяць пакленняў» у рамках тэлепраекта «Плошча Перамогі». Што да кінастужак, то іх выбар даволі разнастайны. У суботу — прэм'ерны паказ шпіёнскай меладрамы «Пераклад з нямецкай» (рэжысёр Андрэй Мармантаў, 2019 г.), у нядзелю чакаем паказ ваенна-прыгодніцкага баевіка «Танкі» (рэжысёр Кім Дружынін, 2018 г.). А 9 мая пройдзе паказ серыяла «Па законах ваеннага часу», мастацка-публіцыстычнага фільма «Засакрэчаная вайна». Таму сачыце за праграмай, каб не прапусціць фільмы і праграмы, якія выбралі для сябе.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Беларусь 1

**5.55** Добрай раніцы, Беларусь!
**9.00, 10.40, 12.00, 15.00, 18.00, 20.00** Інфармацыйны канал «Дзень Перамогі».
**9.40, 12.40, 15.40** Тэлефільм АТН «Тайныя сцежкі» (12+).
**10.15** Спецыяльны рэпартаж АТН (12+).
**11.00** Шэсце пакаленняў і ўскладанне кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!»
**11.40** «Засакрэчаная вайна». Мастацка-публіцыстычны фільм (12+).
**13.10, 16.05, 18.40, 23.00 Серыял «Па законах ваеннага часу. Перамога!» (12+)**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**21.15** Зразумелая палітыка.
**21.30** Гала-канцэрт «Памяць пакаленняў».

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.20** Тэлебарометр.
**9.05 Драма «Брэсцкая крэпасць» (12+).**
**11.15, 18.00 Серыял «Спадарожнікі» (16+).**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.25, 21.20 Серыял «Чакай мяне» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.20 Ваенная драма «Радзіма ці смерць» (12+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Лыжка для салдата». М/ф (6+).
**7.50 «Сын палка». Маст. фільм (12+).**
**10.00** Фестываль армейскай песні «Звязда».
**11.40 «Гарачы снег». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**13.20** Канцэрт Руслана Аляхно «За жыццё!»
**14.25 «Быў месяц май». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**16.15** Урачысты сход і канцэрт майстроў мастацтваў «Парк Перамогі».
**17.55** «Хвіліна маўчання».
**18.00 «Яны змагаліся за Радзіму». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05, 21.25** «Ляцяць жураўлі». Дак. фільм (12+) [СЦ].
**22.55** Канцэрт да Дня Перамогі.

## Беларусь 5

**7.00, 23.45** Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.
**7.30** Вынікі тыдня.
**8.15** Хакей. Таварыскі турнір.
**10.10** «Гарачыня на лёдзе».
**12.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Макслайн» (Рагачоў) — «Шахцёр» (Петрыкаў).
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Дзяўчаты (U-17). Нідэрланды — Данія.
**16.55, 19.05** Спорт-цэнтр.
**17.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Ньюкасл».
